# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 378.096:[94(476)+069.01]:378.4:[008+7](476-25)(091)

*М. А. Бяспалая*

## Адукацыйная прастора кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства: эвалюцыя структуры і зместу

*Разглядаецца эвалюцыя кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў як адукацыйнай, навуковай і выхаваўчай прасторы.*



**Марыя Аркадзьеўна Бяспалая**

Доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Паўнавартасная гуманітарная адукацыя прадугледжвае назапашванне шырокага спектра гістарычных ведаў. Прафесійныя ўменні і навыкі спецыялістаў у галіне культуры і мастацтваў будуюцца на вывучэнні і трансляцыі культурнай спадчыны мінулых пакаленняў. Перафразіруючы вядомае лацінскае выслоўе, скажам, што культура не ведае скачкоў, яна не здольна развівацца без гістарычнага фундамента, яго асэнсавання і пераймання. Безумоўна, вучэбныя планы на ўсіх спецыяльнасцях універсітэта прадугледжваюць курсы па гісторыі, напрыклад, гісторыі музыкі, сацыякультурнай дзейнасці, бібліятэчнай справы і г. д. Аднак веды па фундаментальнай гісторыі з'яўляюцца падмуркам, на якім грунтуюцца, паглыбляюцца і прафілізуюцца веды па адпаведных кірунках культуры і мастацтва.

З першых дзён існавання Мінскага інстытута культуры пачала дзейнічаць кафедра гісторыі СССР, БССР і замежных краін. Яе ўзначаліў і больш за 30 гадоў кіраваў спачатку кандыдат, а з 1986 г. доктар гістарычных навук, прафесар А. П. Грыцкевіч. З 2006 г. па 2008 г. кафедру ўзначальваў доктар культуралогіі, прафесар А. І. Смолік, з 2009 г. – доктар гістарычных навук,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесар М. А. Бяспалая. На працягу 10 гадоў студэнтам выкладаліся ўсе курсы, пералічаныя ў назве кафедры. Найбольш гадзін выдзялялася на гісторыю СССР, а гісторыя БССР была прадстаўлена невялікім курсам у 36 гадзін. На наш погляд, станоўчым было выкладанне гісторыі замежных краін, праўда, у невялікім аб'ёме, але студэнты мелі магчымасць асвяжыць школьныя веды па замежнай гісторыі. Тым больш, што выкладчыкі кафедры імкнуліся пры распрацоўцы ўсіх курсаў улічваць спецыфіку інстытута. Дарэчы, на ўступных экзаменах абітурыенты здавалі гісторыю СССР.

Сітуацыя з выкладаннем гісторыі мяняецца ў другой палове 1980-х гг., што было звязана з пераменамі ў сацыяльна-палітычным жыцці грамадства. Кафедра пачала паступова пераходзіць на выкладанне айчыннай гісторыі на беларускай мове, былі ліквідаваны гадзіны на замежную гісторыю, а пасля 1991 г. і на гісторыю СССР. Цікава, што гэта дастаткова ўнушальная лічба, асабліва калі дадаць і гадзіны па гісторыі КПСС, растварылася ў новых навучальных планах, якія распрацоўваліся ў рэспубліцы, а не спускаліся цэнтралізавана зверху, як было раней. Кафедра была перайменавана і пачала называцца кафедрай гісторыі Беларусі. Праўда, яе толькі ўскосна закранула складаная арганізацыйная работа па стварэнні шматлікіх вучэбных планаў і стандартаў па новых спецыяльнасцях Беларускага ўніверсітэта культуры. Як агульнаўніверсітэцкая кафедра гісторыі Беларусі атрымоўвала своеасаблівы адукацыйны заказ ад спецыяльных кафедр універсітэта.

Калектыў кафедры перажываў перамены не толькі ў структуры выкладаемых курсаў, памяншэнні гадзін і, адпаведна, выкладчыкаў, але і ў арганізацыйным плане. На некалькі гадоў кафедра была аб'яднана з кафедрай філасофіі. Сітуацыя змянілася пасля рашэння кіраўніцтва ўніверсітэта аб перадачы спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны», адкрытай у 1994 г.,



**1.** Доктар гістарычных навук, прафесар А. П. Грыцкевіч




**2.** Герб кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




**3.** Калектыў кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства

на кафедру гісторыі Беларусі, у назву якой быў дабаўлены тэрмін «музеязнаўства». Пад гэтай назвай кафедра існуе па цяперашні час.

Такім чынам, структура і функцыі яе дзейнасці кадрынальна змяніліся. З аднаго боку, кафедра захавала агульнаўніверсітэцкі статус, з другога – стала выпускаючай, з 1996 г. пачала рыхтаваць магістраў, а з 1997 г. і аспірантаў у галіне музеязнаўства. У адрозненне ад спецыяльных кафедр універсітэта, у вызначэнні задач і зместу падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музеязнаўства яна арыентуецца на вучэбныя планы і стандарты, распрацаваныя на гістарычным факультэце БДУ. Гэтая акалічнасць пэўным чынам стрымлівае ініцыятыву кафедры, якая мае магчымасць уносіць свае прапановы толькі ў курсы па выбары студэнта. Тым не менш кваліфікацыя «музеязнаўца», якую атрымоўваюць нашы выпускнікі, дазваляе заняць сваю нішу ў падрыхтоўцы спецыялістаў музейнай справы.

У сістэме Міністэрства культуры налічваецца каля 150 музеяў рознага профілю, і выпускнікі кафедры надзвычай запатрабаваны, аб чым сведчаць запыты ў час размеркавання. Яны працуюць дырэктарамі абласных і раённых краязнаўчых музеяў, галоўнымі захавальнікамі фондаў, загадчыкамі аддзелаў, навуковымі супрацоўнікамі. Цесныя сувязі наладжаны з Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, да трэці навуковых супрацоўнікаў якога складаюць выпускнікі кафедры. Буйнейшае музейнае аб'яднанне Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік узначальвае выпускніца аспірантуры БДУКМ, кандыдат культуралогіі Т. А. Джумантаева.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кафедра не стаіць на месцы, а актыўна распрацоўвае сучасныя падыходы як да арганізацыі, методыкі навучання, так і да вылучэння новых кірункаў спецыяльнасці. З 2012/13 навучальнага года пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па напрамку «культурная спадчына і турызм». З аднаго боку, гэта патрабавала шмат намаганняў па напаўненні вучэбнага плана спецыяльнымі курсамі па выбары, арганізацыі азнаямляльнай і вытворчай практыкі, а з другога – пашырыла знешнія кантакты кафедры як у межах рэспублікі, так і з навучальнымі, музейнымі і турыстычнымі ўстановамі Расіі, Літвы, Германіі, Славакіі і інш. Кафедра плануе ажыццяўленне міжнародных турыстычных паездак пры актыўным удзеле студэнтаў у распрацоўцы маршрутаў, іх арганізацыйнага і экскурсійнага забеспячэння.

На працягу існавання кафедры важнейшай часткай работы выкладчыкаў з’яўлялася навукова-даследчая дзейнасць. Дзякуючы навуковаму аўтарытэту А. П. Грыцкевіча, У. С. Пасэ, А. А. Трусава, В. А. Цітова, І. К. Цішчанкі і іншых выкладчыкаў, кафедра заўсёды займала адно з вядучых месцаў ва ўніверсітэце. Супрацоўнікі кафедры з’яўляліся аўтарамі манаграфій, артыкулаў у часопісах, энцыклапедыях, выступалі з дакладамі на навуковых канферэнцыях рознага ўзроўню і г. д.

Акрамя індывідуальнай навуковай дзейнасці, калектыў кафедры пачынаючы з 1981 г. выконваў і выконвае комплексныя кафедральныя тэмы. Першая – «Культурна-асветніцкія ўстановы і іх дзейнасць (1861–1917 гг.)». Відавочна, што тэма непасрэдна звязана з профілем установы вышэйшай адукацыі, таму ў яе праблематыцы адразу закладваўся практычны аспект. Навуковы калектыў даследаваў сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы дзейнасці вывучаемых аб’ектаў, якія падзяляліся на культурна-асветніцкія аб’яднанні афіцыйнага кірунку, у тым ліку рэлігійныя, навукова-гаспадарчыя і дабрачынныя, грамадскія таварыствы ліберальнага і рэвалюцыйна-дэмакратычнага характару. Вывучалася дзейнасць Паўночна-Заходняга аддзела Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства, экспедыцыі С. У. Максімава, П. П. Губінскага, таварыства аматараў прыродазнаўства, астраноміі, этнаграфіі пры Маскоўскім універсітэце, таварыстваў урачоў у Віцебску, Магілёве, Мінску, «Таварыства цвярозасці», Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў у Мінску і інш.

У выніку даследавання былі вылучаны і прааналізаваны формы культурна-асветніцкай дзейнасці ў 1861–1917 гг., якія, безумоўна, адпавядаюць і сучасным: публічныя лекцыі, народныя чытанні, музычныя і харавыя канцэрты, тэатральныя спектаклі, літаратурна-музычныя вечары, мастацкія выставы і г. д. Дзякуючы скрупулёзнай працы ў архівах, знаёмству з тагачаснай перыёдыкай, афіцыйнымі дакументамі, мемуарнай літаратурай у навуковы зварот пры дапамозе публікацый была ўведзена значная колькасць новага фактагагічнага матэрыялу, зроблены высновы аб пераемнасці форм і метадаў культурна-асветніцкай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля аб’яднання і спалучэння на кафедры выкладання гісторыі і музеязнаўчых дысцыплін навуковая дзейнасць скіравалася на даследаванне гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, а менавіта яе захаванне і трансляцыі ў музеях. Навуковыя кірункі даследавання гэтай праблемы ўключаюць вывучэнне тэарэтыка-метадалагічных асноў музея як сацыякультурнага інстытута, гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы складнікі, вызначэнне месца гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ў сусветнай культурнай прасторы і распрацоўку актуальных праблем музеязнаўства ў межах акрэсленай тэмы.

Вынікам шматгадовай працы па гэтых кірунках з’яўляюцца шматлікія публікацыі выкладчыкаў кафедры ў айчынных і замежных выданнях. Яны ахопліваюць праблемы вывучэння, захавання і трансляцыі этнаграфічных, нумізматычных, дакументальных, выяўленчых музейных калекцый. Дзякуючы публікацыям у навуковы зварот упершыню ўведзены матэрыялы, якія захоўваюцца ў фондах музеяў. Да іх можна аднесці дакументы аб дзейнасці мінскага Таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, аб дзейнасці Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта з фондаў Дзяржаўнага музея Янкі Купалы, шмат цікавых і малавядомых дакументаў, якія захоўваюцца ў рэгіянальных музеях.

Навуковыя інтарэсы выкладчыкаў кафедры ахопліваюць розныя галіны гістарычных ведаў: у праблемным полі гісторыі Беларусі працавалі і працуюць дактары гістарычных навук, прафесары А. П. Грыцкевіч і М. А. Бяспалая, у галіне нумізматыкі – кандыдат гістарычных навук, дацэнт І. Н. Колабава, этнаграфіі – кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. М. Нароўская, архітэктуры – кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. А. Трусаў, па праблематыцы крыніцазнаўства – кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. Я. Паўлава. У разрэзе музеязнаўчай тэматыкі працуюць кандыдаты культуралогіі Я. Л. Іванова, І. Г. Лупашка, старшы выкладчык І. І. Бамбешка. Актыўна працуе над доктарскай дысертацыяй у галіне гістарыяграфіі новай гісторыі кандыдат гістарычных навук, дацэнт Л. У. Ляховіч (Ландзіна). Пэўныя спадзяванні на забеспячэнне выкладання дысцыплін па спецыяльнасці «менеджар па культурнай спадчыне і турызму» кафедра звязвае з Д. В. Герасімёнкам.

Плённая праца выкладчыкаў знаходзіць увасабленне ў манаграфіях, навукова-папулярных выданнях, сумесных даследаваннях і выданнях з іншымі ўстановамі. Напрыклад, у 2012 г. апублікавана «Выбранае» А.П.Грыцкевіча ў серыі «Гісторыка-літаратурныя помнікі» выдавецтва «Беларускі кнігазбор», у 2015 г. выйшла работа А. А. Трусава «Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі», М. А. Бяспалая і А. Я. Паўлава ўвайшлі ў лік аўтараў калектыўнай манаграфіі, выдадзенай ў 2011 г. Інстытутам гісторыі НАН Беларусі «Памяць аб вайне ў сістэме патрыятычнага выхавання».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




А. М. Нароўская з'яўляецца аўтарам раздзела «Традыцыйны інтэр'ер беларускага жылля» ў шматтомнай калектыўнай манаграфіі «Нарысы гісторыі культуры Беларусі», якая выдаецца НАН Беларусі. Да месца будзе сказаць аб цесным супрацоўніцтве кафедры з дзвюма навуковымі ўстановамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – Інстытутам гісторыі і Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Штогод пад патранажам Інстытута гісторыі праводзіцца археалагічная практыка студэнтаў (на гарадзішчы старажытнага Мінска), якой кіруе выпускнік кафедры, кандыдат гістарычных навук А. В. Вайцэховіч. Азнаямляльная практыка студэнтаў 2-га курса заўсёды праходзіць у навукова-даследчым цэнтры «Музей старажытнай беларускай культуры» Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору.

Калектыў кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства, якая з'яўляецца адзінай кафедрай у рэспубліцы, дзе рыхтуюцца спецыялісты з кваліфікацыяй «музеязнаўца», усведамляе сваю адказнасць за распрацоўку важнейшых праблем музеязнаўчай навукі і практыкі і падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі.




**4, 5.** Выданні выкладчыкаў кафедры, зборнікі матэрыялаў канферэнцый, у арганізацыі якіх прымала ўдзел кафедра

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ





У гэтым кірунку таксама напрацаваны пэўны вопыт цеснага супрацоўніцтва фактычна з усімі музеямі рэспублікі. У 2011–2015 гг. кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўдзельнічала ў выкананні задання К-04 Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады, у якім прымалі ўдзел не толькі спецыялісты кафедры, але і спецыялісты-практыкі з многіх музеяў Беларусі.

Супрацоўніцтва з рэгіянальнымі музеямі адлюстроўваецца ў сумесным правядзенні Тышкевіцкіх чытанняў (пачынаючы з 2007 г. іх праведзена пяць: спачатку на базе ўніверсітэта, потым у Лагойску, Вілейцы, Валожыне і Крэцінзе (Літва), сумесных з музеямі навукова-практычных канферэнцыях і круглых сталах, удзеле ў навуковых канферэнцыях музейнай тэматыкі ў музеях Віцебска, Маладзечна, Веткі, Мінска, Полацка і інш.

Як самае важнае дасягненне кафедры з пункту гледжання развіцця музеязнаўчай навукі ў Беларусі можна разглядаць абарону трох кандыдацкіх дысертацый Т. А. Джумантаевай, Я. Л. Івановай і І. Г. Лупашка з прысваеннем ім навуковай ступені кандыдата культуралогіі. У бліжэйшы час адбудзецца абарона кандыдацкай дысертацыі Я. А. Кавалёва на тэму «Музеефікацыя культурнай спадчыны беларускага сектара чарнобыльскай зоны».

У 2014 г. кафедра адзначала 20-годдзе спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». На святочнае мерапрыемства з'ехаліся былыя выпускнікі з усёй рэспублікі. Намаганнямі сённяшніх студэнтаў была арганізавана ўрачыстая імпрэза, якая прадэманстравала творчыя магчымасці будучых музейных спецыялістаў, іх разуменне грамадскай значнасці абранай прафесіі. Аднак самым цікавым і карысным мерапрыемствам быў круглы стол, за якім адбыўся абмен думкамі паміж спецыялістамі музейнай справы, выкладчыкамі музейных дысцыплін і студэнтамі. Разважаннямі аб праблемах музейнай прафесіі, яе перспектывах падзяліліся выпускніцы аспірантуры Т. А. Джумантаева, дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, А. Р. Ляшкевіч, дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, Г. У. Савіцкі, выпускнік кафедры, дырэктар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, С. М. Ганчар, выпускнік кафедры, дырэктар Вілейскага раённага краязнаўчага музея і многія іншыя.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Такім чынам, можна канстатаваць, што арганізацыйная структура кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства, пералік дысцыплін, якія яна забяспечвае, іх змястоўнае напаўненне, методыка выкладання эвалюцыяніравалі адпаведна пераменам у сацыяльна-палітычнай і сацыякультурнай сферах. Калектыў кафедры змог заняць належнае месца ў структуры ўніверсітэта, забяспечыць высокі ўзровень выкладання дысцыплін музеязнаўчага і турыстычнага профілю, упісацца ў працэс перабудовы сістэмы вышэйшай адукацыі, захаваць напрацаваны вопыт выкладання гістарычных дысцыплін, прыстасаваць яго да профілю ўніверсітэта. На аўтарытэт роднай навучальнай установы актыўна працуе навукова-даследчы калектыў кафедры, які падтрымлівае цесныя навуковыя сувязі з профільнымі ўстановамі НАН Беларусі, музеямі Рэспублікі Беларусь усіх катэгорый, установамі вышэйшай адукацыі замежжа.

*M. Byaspalaya*

**Education space of the Department of History and Museology: the evolution of structure and contents**

*The evolution of the Department of History of Belarus and Museology of the Belarusian State University of Culture and Arts as an educational and scientific space is considered.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 22.06.2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ